КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
А.В. Макоўчык
"27" 2020 г.

Рэгістрацыйны № УД-31-2-36/вуч.

# АСНОВЫ БЕЛАРУСІСТЫКІ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па факультатыўнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:

**1 – 02 03 02 Руская мова і літаратура (для замежных грамадзян);**
**1-02 03 04 Руская мова і літаратура.**
**Замежная мова (для замежных грамадзян)**

2020 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта ОСВО 1-02 03 04, уведзенага ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.08.2013 г. № 88 і вучэбных планаў для спецыяльнасцей 1 – 02 03 02 Руская мова і літаратура, 1-02 03 04 Руская мова і літаратура. Замежная мова (для замежных грамадзян)

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Н.У. Чайка, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", доктар філалагічных навук, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.С. Васілеўская, загадчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства, БДПУ кандыдат філалагічных навук, дацэнт

Г.К. Чахоўскі, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

(пратакол № 10 ад 20.04.2020 г.)

Загадчык кафедры ____________ Д.В. Дзятко

Саветам філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"
(пратакол № 9 ад 27.05.2020 г.)

Старшыня савета ____________ В.Д. Старычонак

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела ____________ С.А. Старадуб

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П. Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэта факультатыўнай дысцыпліны “Асновы беларусістыкі”** – пазнаёміць студэнтаў з гісторыяй і асноўнымі заканамернасцямі фарміравання беларускай нацыі, з комплексам навуковых ведаў пра беларусаў і Беларусь і гісторыяй іх станаўлення.

**Задачы вывучэння факультатыўнай дысцыпліны “Асновы беларусістыкі”:**

– даць уяўленне аб беларусазнаўстве як вучэбнай дысцыпліне;

– пазнаёміць з этапамі развіцця і навуковымі дасягненнямі айчыннай і замежнай беларусістыкі;

– разгледзець асноўныя канцэпцыі этнагенезу беларусаў, растлумацыць уплыў грамадска-палітычных на фарміраванне беларускага этнасу;

– паказаць месца і ролю нацыянальных меншасцяў у інтэлектуальнай, духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў;

– разгледзець уплыў прыроднага асяроддзя беларусаў, экалагічнай сітуацыі на фарміраванне беларускага этнасу і яго мовы;

– разгледзець ролю і месца рэлігійнагага кампаненту ў гісторыі беларускага грамадства;

– навучыць арыентавацца ў спецыяльнай і навукова-папулярнай літаратуры і самастойна знаходзіць адказы на складаныя пытанні нацыянальнай гісторыі і сучаснасці.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй..* “Асновы беларусістыкі” – вучэбная дысцыпліна, якая мае ярка выражаны міждысцыплінарны характар, што абумоўлена яе аб’ектам даследавання. Паколькі беларусістыка, славянскія мовы і народы вывучаюцца ў мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, гісторыі і інш., то гэта дазваляе настаўніку ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры на дадзеным матэрыяле паспяхова ажыццяўляць міжпрадметныя сувязі.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.* Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яго з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі (параўнальнай граматыкай усходнеславянскіх моў, стараславянскай мовай і інш.), а таксама са школьным курсам рускай мовы. Асаблівая ўвага пры выкладанні асобных тэм павінна ўдзяляцца вывучэнню спецыфічных асаблівасцей славянскіх народаў і іх моў. Лекцыйныя заняткі, прадугледжаныя вучэбным планам, узаемна звязаны і арганічна дапаўняюць адно аднаго, даючы магчымасць паглыбіць і ўдасканаліць набытыя веды.

Вывучэнне факультатыўнай дысцыпліны “Асновы беларусістыкі” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў *акадэмічных, сацыяльна-асобасных і прафесійных кампетэнцый.*

***Патрабаванні да акадэмічных кампетэнцый***

Студэнт павінен:

АК-3. Валодаць даследчыцкімі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным ствараць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-7. Мець навыкі, якія звязаны з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў, кіраваннем інфармацыяй і працай з камп'ютарам.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-10. Умець рэгуляваць узаемадзеянні ў адукацыйным працэсе.

***Патрабаванні да сацыяльна-асобасных кампетэнцый спецыяліста***

Студэнт павінен:

СЛК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

СЛК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

СЛК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

СЛК-7. Быць здольным да самаадукацыі і ўдасканалення прафесійнай дзейнасці.

***Патрабаванні да прафесійных кампетэнцый***

Студэнт павінен быць здольным:

ПК-2. Выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:**

– асноўныя этапы станаўлення беларусістыкі як навукі;

– ролю палітычных і моўных фактараў у фарміраванні этнічнай тэрыторыі беларусаў;

– уплыў прыродных і гуманітарных фактараў на розныя аспекты жыццядзейнасці беларускага народа;

– месца этнічных меншасцяў, а таксама беларускіх дыяспар у станаўленні беларускай культуры, навукі і нацыянальнай мовы.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **умець:**

– арыентавацца ў навуковых канцэпцыях этнагенэзу беларусаў;

– арыентавацца ў навуковай і навукова-папулярнай літаратуры па беларусазнаўчай праблематыцы;

– аналізаваць ключавыя праблемы нацыянальнай свядомасці, развіцця мовы і культуры, а таксама рэлігійнага становішча;

– праводзіць культуралагічныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **валодаць:**

– сістэмай тэарэтычных ведаў па гісторыі развіцця і станаўленні беларускай культуры, навукі, этнаграфіі;

– навыкамі гістарычнага аналізу фактаў гісторыі, культуры, навукі на Беларусі;

– навыкамі практычнага выкарыстання тэарэтычных ведаў пры аналізе розных гісторыка-культуралагічных фактаў;

– уменнем разглядаць сучасныя гісторыка-культуралагічныя факты ў іх дынаміцы.

У адпаведнасці з вучэбным планам установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" на вывучэнне вучэбнай

дысцыпліны “Асновы беларусістыкі” на 1 курсе адводзіцца: усяго – 20 гадзін, аўдыторных – 20 гадзін.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая.

*Размеркаванне гадзін па семестрах на дзённым аддзяленні:*

2 семестр:

Лекцыі – 20 гадзін.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**1. Уводзіны.** Змест і задачы “Асноў беларусістыкі”. “Асновы беларусістыкі” як вучэбная дысцыпліна, яе сувязь з гуманітарнымі і прыродазнаўчымі цыкламі.

**2. Асноўныя этапы станаўлення беларусістыкі.**

*2.1. Узнікненне і развіццё беларусістыкі ў канцы XVIII стагоддзя – 80-х гадах XIX стагоддзя.* Роля выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта ў распаўсюджанні навуковых ведаў па беларускай гісторыі, філалогіі і этнаграфіі. Дзейнасць Віленскай археаграфічнай камісіі. Ліцвінская традыцыя і заходнерусізм.

*2.2. Развіццё беларусістыкі ў 80-я гады XIX стагоддзя да рэвалюцыі 1905 года.* Уплыў народніцтва на беларускую нацыянальную ідэалогію. Роля часопіса "Гоман" у адстойванні права беларусаў на этнічную самабытнасць і тэрытарыяльную аўтаномію. Дзейнасць “Круга беларускай народнай прасветы і культуры” і Беларускай сацыялістычнай грамады.

*2.3. Навуковая дзейнасць беларускіх даследчыкаў на мяжы XIX – XX стагоддзяў.* Дзейнасць Я.Карскага, І.Насовіча, К.Калайдовіча, П.Шпілеўскага, П.Шэйна, М.Нікіфароўскага, Е.Раманава, І.Грыгаровіча, А.Кіркора і інш.

**3. Прыродныя ўмовы і іх сувязь з жыццядзейнасцю беларусаў ад старажытнасці да нашых дзён.**

*3.1. Фарміраванне беларускага этнасу ў адпаведнасці з дадзенымі гісторыі, археалогіі і антрапалогіі.* Этымалогія і сэнс тэрміна “этнагенез”. Індаеўрапейскія вытокі беларусаў. Асноўныя канцэпцыі этнагенезу беларусаў: крывіцка-дрыгавіцка-радзіміцкія тэорыі; балцкі субстрат у этнагенезе беларусаў; гіпотэза старажытнарускай народнасці як асновы складвання беларускага, рускага і ўкраінскага народаў; старажытныя “беларусцы” і “палешукі” ў этнагенезе беларусаў; ступень абгрунтаванасці гэтых канцэпцый. Міграцыі насельніцтва, дэмаграфічныя катаклізмы, іх уплыў на станаўленне і развіццё беларускага этнасу. Іншамоўны субстрат і кампанент у беларускай мове (погляды Я.Карскага, І.Воўка-Левановіча, Ю.Шавялёва, П.Векслера і інш.).

*3.2. Этнічныя меншасці ў Беларусі, іх уклад у нацыянальную культуру.* Гістарычныя прычыны з’яўлення нацыянальных меншасцяў на тэрыторыі Беларусі. Становішча, заняткі гэтых нацыянальных супольнасцей і іх узаемаадносіны з мясцовым беларускім насельніцтвам. Тыпалогія міжнацыянальных адносін. Сучаснае становішча міжнацыянальных узаемаадносін у Рэспубліцы Беларусь. Абшчыны яўрэяў, татар, літоўцаў, палякаў, украінцаў, рускіх і цыган у Беларусі, іх уклад у нацыянальную культуру.

**4. Фарміраванне этнічнай тэрыторыі беларусаў ў сувязі з палітычнымі і моўнымі фактарамі.**

*4.1. Станаўленне беларускай дзяржаўнасці.* Першасныя вытокі дзяржаўнасці на Беларусі (“княжанне”). Полацкае княства – адно з першых магутных дзяржаўных утварэнняў на землях Беларусі. Утварэнне Вялікага

Княства Літоўскага (ВКЛ), яго росквіт і заняпад. Перавага беларускасці ў культуры дзяржавы. Агульная характарыстыка ВКЛ як буйной еўрапейскай дзяржавы: органы дзяржаўнай улады, грошы, дзяржаўныя сімвалы, самакіраванне, тып дзяржаўнага праўлення і г.д.

*4.2. Этнічная тэрыторыя беларусаў у складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі.* Адначасовае суіснаванне ВКЛ і Рэчы Паспалітай на працягу другой паловы XVI – канца XVIII стагоддзяў. Асноўныя заканадаўчыя акты ВКЛ (статуты, граматы, прывілеі і інш.). Ліквідацыя беларускай дзяржаўнасці пасля далучэння зямель этнічнай Беларусі да Расійскай імперыі ў канцы XVIII стагоддзя. “Паўночна-Заходні край” – афіцыйная назва Беларусі ў XIX – пачатку XX стагоддзя.

*4.3. Асаблівасці фарміравання этнічных зямель беларусаў у XX стагоддзі.* Узмацненне нацыянальна-вызваленчага руху з мэтай аднаўлення беларускай дзяржаўнасці ў пачатку XX стагоддзя. Утварэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Атрыбуты БНР у 1918 – 1920 гадах. Узнікненне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР) і яе развіццё да пачатку 90-х гадоў. Набыццё рэспублікай дзяржаўнага суверэнітэту і незалежнасці ў сучасны перыяд. Атрыбуты нацыянальнага суверэнітэту (герб, сцяг, гімн, валюта, Канстытуцыя і інш.). Месца і роля Рэспублікі Беларусь сярод іншых дзяржаў свету. Этнічная тэрыторыя і моўны кантынуум беларусаў на сучасным этапе.

**5. Ментальнасць, нацыянальны характар беларуса і нацыянальная свядомасць.** Этымалогія і сэнс тэрмінаў “ментальнасць”, “менталітэт”, “нацыянальны характар”. Вытокі самабытнасці беларускай ментальнасці і нацыянальнага характару. Фарміраванне ментальнасці і характару беларусаў. Уплыў язычніцтва і хрысціянства на станаўленне і эвалюцыю нацыянальнага характару, менталітэту беларусаў. Станоўчыя і адмоўныя рысы беларускага нацыянальнага характару. Беларускі нацыянальны характар: сацыяльныя і культурныя стэрэатыпы.

**6. Роля рэлігійнага фактару ў станаўленні беларускай нацыі, яе культуры і мовы.**

*6.1. Язычніцтва на беларускіх землях.* Асаблівасці язычніцкіх культаў і рытуалаў усходніх славян. Язычніцкі пантэон багоў. Элементы язычніцкага светаўспрымання ў жыцці беларусаў у наш час.

*6.2. Хрысціянства на беларускіх землях.* Гісторыя станаўлення хрысціянства на славянскіх землях. Адначасовае суіснаванне язычніцтва і хрысціянства. Уплыў хрысціянства на развіццё культуры ў Полацкім княстве і Вялікім Княстве Літоўскім. Роля хрысціянства ў сістэме адукацыі. Хрысціянскія цэрквы на Беларусі да канца XV стагоддзя.

*6.3. Хрысціянскія канфесіі на Беларусі ў XVI – XVIII стагоддзях.* Рэфармацыя. Асноўныя плыні пратэстанцтва і іх уплыў на развіццё культуры Беларусі. Контррэфармацыя. Езуіцкі ордэн і яго дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. Распаўсюджанне уніяцтва на тэрыторыі Беларусі. Дзейнасць уніяцкіх брацтваў.

*6.4. Рэлігійнае становішча ў Беларусі ў XIX – XXI стагоддзях.* Рэлігійная сітуацыя на беларускіх землях пасля падзелу Рэчы Паспалітай. Ліквідацыя уніяцтва. Хрысціянства ў Беларусі пасля 1917 года. Праваслаўная царква і каталіцкі касцёл падчас Другой сусветнай вайны. Рэлігійная сітуацыя на тэрыторыі Беларусі пасля 1945 года. Канфесійнае жыццё Беларусі ў канцы XX – XXI стагоддзях. Спецыфіка міжканфесійных адносін. Традыцыйныя хрысціянскія канфесіі (праваслаўе і каталіцызм), пратэстанцкія цэрквы, царква стараабрадцаў, мусульманская і іудзейская рэлігіі і іх уплыў на развіццё культуры.

**7. Мова беларускага этнасу, мова народа і нацыянальная мова.**

*7.1. Беларуская мова: яе паходжанне і развіццё.* Беларуская мова як адна з індаеўрапейскіх моў. Беларуская мова часоў Вялікага Княства Літоўскага. Новая (нацыянальная) беларуская літаратурная мова. Роля лацінкі і кірыліцы ў гісторыі беларускай мовы. Русіфікацыя беларускай мовы ў савецкі час. Канцэпцыя абнаўлення нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

*7.2. Узаемасувязь мовы і нацыянальнай самасвядомасці ў гістарычным кантэксце і на сучасным этапе.* Беларуская этналінгвістыка і асноўныя кірункі яе развіцця. Нацыянальная мова ў сучасным беларускім грамадстве.

**8. Беларускія дыяспары, іх уклад у нацыянальную культуру і навуку.** Фарміраванне беларускай дыяспары, асноўныя этапы яе развіцця. Прычыны эміграцыі з Беларусі на розных этапах айчыннай гісторыі. Праблемы захавання беларускімі эмігрантамі сваёй этнічнай і моўна-культурнай самабытнасці. Найбольш значныя асяродкі беларусаў за межамі Бацькаўшчыны, іх роля ў пашырэнні беларускай культуры ў свеце. Даследаванні ў галіне беларускай філалогіі па-за межамі Беларусі (работы Н. Баршчэўскай, А. Мак-Міліна, А. Золтана, Г. Бідэра, Р. Піўтарака, М. Нікалаева і інш.)

## Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны па выбары
## (дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | літаратура |
|---|---|---|---|
| | | **Лекцыі** | |
| | **АСНОВЫ БЕЛАРУСІСТЫКІ** | **20** | |
| **1.** | **Уводзіны** | **2** | |
| **2.** | **Асноўныя этапы станаўлення беларусістыкі** | **4** | |
| 2.1. | Узнікненне і развіццё беларусістыкі ў канцы XVIII стагоддзя – 80-х гадах XIX стагоддзя | 1 | 1,2 |
| 2.2. | Развіццё беларусістыкі ў 80-я гады XIX стагоддзя да рэвалюцыі 1905 года | 1 | |
| 2.3. | Навуковая дзейнасць беларускіх даследчыкаў на мяжы XIX – XX стагоддзяў | 2 | |
| **3.** | **Прыродныя ўмовы і іх сувязь з жыццядзейнасцю беларусаў ад старажытнасці да нашых дзён** | **2** | |
| 3.1. | Фарміраванне беларускага этнасу ў адпаведнасці з дадзенымі гісторыі, археалогіі і антрапалогіі | 1 | 1,2 |
| 3.2. | Этнічныя меншасці ў Беларусі, іх уклад у нацыянальную культуру | 1 | |
| **4.** | **Фарміраванне этнічнай тэрыторыі беларусаў ў сувязі з палітычнымі і моўнымі фактарамі** | **4** | |
| 4.1. | Станаўленне беларускай дзяржаўнасці | 1 | 1,2 |
| 4.2. | Этнічная тэрыторыя беларусаў у складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі | 1 | |
| 4.3. | Асаблівасці фарміравання этнічных зямель беларусаў у XX стагоддзі | 2 | |
| **5.** | **Беларускі нацыянальны характар** | **1** | |
| **6.** | **Роля рэлігійнага фактару ў станаўленні беларускай нацыі, яе культуры і мовы** | **4** | |
| 6.1. | Язычніцтва на беларускіх землях | 1 | 1,2 |
| 6.2. | Хрысціянства на беларускіх землях | 1 | |
| 6.3. | Хрысціянскія канфесіі на Беларусі ў XVI–XVIII стагоддзях | 1 | |
| 6.4. | Рэлігійнае становішча ў Беларусі ў XIX–XXI стагоддзях | 1 | |
| **7.** | **Мова беларускага этнасу, мова народа і нацыянальная мова** | **2** | |
| 7.1. | Беларуская мова: яе паходжанне і развіццё | 1 | 1,2 |
| 7.2. | Узаемасувязь мовы і нацыянальнай самасвядомасці ў гістарычным кантэксце і на сучасным этапе | 1 | |
| **8.** | **Беларускія дыяспары, іх уклад у нацыянальную культуру і навуку** | **1** | |
| | **Усяго:** | **20** | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Гранкина, Е. В. Литературоведческое страноведение [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс для специальностей 1-02 03 02 «Русский язык и литература» / Е. В. Гранкина // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/350. – Дата доступа: 08.06.2020.
2. Лугоўскі, А. І. Літаратурнае краязнаўства [Электронный ресурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура ; 1-02 03 03-04 Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы) // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: http://elib.bspu.by/handle/doc/2535. – Дата доступу: 08.06.2020.

**Дадатковая литаратура**

1. Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / А. А. Воінаў [і інш.] ; пад рэд. А. А. Воінава. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1993. – 620 с.
2. Асветнікі зямлі беларускай : энцыкл. давед. / Г. П. Пашкоў [і інш.] ; пад рэд. Г. П. Пашкова. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2006. – 496 с.
3. Грыцкевіч, В. П. Гісторыя, самасвядомасць, этнас / В. П. Грыцкевіч // Маладосць. – 1994. – № 3. – С. 4–5.
4. Дубянецкі, Э. С. Беларускі нацыянальны характар: спробы даследавання / Э. С. Дубянецкі // Адукацыя і выхаванне. – 1995. – № 5. – С. 29–39.
5. Карскі, Я. Беларусы / Я. Карскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2001. – 640 с.
6. Культура беларускага замежжа : у 3 т. / пад рэд. А. Сабалеўскага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 3 т.
7. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2 т. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2007. – 2 т.
8. Мікуліч, А. І. Беларусы ў генетычнай прасторы: антрапалогія этнасу / А. І. Мікуліч. – Мінск : Тэхналогія, 2005. – 138 с.
9. Мікуліч, Т. М. Мова і этнічная самасвядомасць / Т. М. Мікуліч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1996. – 159 с.
10. Новікаў, С. Я. Курс беларусазнаўства : навуч.-метад. дапам. / С. Я. Новикаў. – Мінск : Ін-т сучас. ведаў, 1998. – 224 с.
11. Саракавік, І. А. Беларусазнаўства / І. А. Саракавік. – Мінск : Веды, 1998. – 284 с.
12. Смятаннікаў, В. С. Беларусазнаўства : вучэб.-метад. дапам. для выкладчыкаў сярэд. спец. навуч. установ / В. С. Смятаннікаў. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 149 с.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| **Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму** |
|---|---|---|---|
| Параўнальная граматыка ўсходнеславянскіх моў | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | няма | Пратакол № 10 ад 20.04.2020 г. |
| Стараславянская мова | мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | няма | Пратакол № 10 ад 20.04.2020 г. |